*Ірына Скварцова*

# ТЫПАЛОГІЯ СЛУЦКІХ ПАЯСОЎ

Слуцкая мануфактура кунтушовых паясоў і яе вырабы займаюць асаблівае месца ў гісторыі шаўкаткацтва Рэчы Паспалітай. У адрозненне ад іншых фабрык мастацкіх тканін краіны, што спецыялізаваліся на вытворчасці ўзорыстых паясоў па ўзору ўсходніх (у Станіславе, Бродах, Корцы, Куткоры, Бучачы, Гродне, Ружанах, Паставах, Кракаве, Варшаве, Ліпкаве, Кабылцы, Сакалове, Гданьску і др.), менавіта ў Слуцку былі не толькі дасканала засвоены, але творча і віртуозна пераасэнсаваны традыцыі арыентальнага мастацкага тэкстылю, і на іх аснове створаны адметны, мастацка самабытны стыль вырабаў, які арганічна злучыў усходнія, заходнееўрапейскія і ўласна беларускія элементы.

Гэта стала магчымым дзякуючы высокапрафесійнай арганізацыі творчага і вытворчага працэсу на мануфактуры, якой кіравалі таленавітыя армянскія мастакі-тэкстыльшчыкі і тэхнолагі: у 1760–1770-х гг. – Аванэс Маджаранц (імя якога ў Беларусі было адаптавана і трансфармавалася ў Яна Маджарскага), а ў 1780-х – 1807 гг. – Лявон Маджарскі, сын Яна.

Дакладнае месца нараджэння Аванэса Маджаранца не вядома. Паводле адной з існуючых версій, гэта Стамбул[1], паводле другой – нейкая армянская калонія Семіграддзя – Трансільваніі[2]. Армянінам венгерскага паходжання быў бацька Маджарскага – Нум (Нума, Нумовіч), што, як бачна, адлюстравалася ў прозвішчы майстра: венгр – мадзьяр – Маджаранц; армянкай была і яго маці Луцыя. Ёсць звесткі пра знаходжанне Маджарскага ў турэцкай няволі, і пра тое, што ў Стамбул ён трапіў у якасці палоннага (што верагодна, калі майстр нарадзіўся ў Трансільваніі). Па меркаванні некаторых даследчыкаў, у Стамбуле ён мог атрымаць або ўдасканаліць атрыманую раней адукацыю і навыкі майстра-тэкстыльшчыка, працуючы на адной з армянскіх ткацкіх мануфактур[3]. У 1750-х гг. Маджарскі пераязджае ў Рэч Паспалітую і ўладкоўваецца працаваць на мануфактуру кунтушовых паясоў у Станіславе (зараз Івана-Франкоўск,

---

[1] А.П. Грицкевич, *Армянская мануфактура в Белоруссии в конце XVIII века*, Вестник общественных наук АН АрмССР 4 (288) (1967) 47.

[2] J. Chruszczyńska, *Pasy kontuszowe z polskich manufaktur i pracowni w zbiorach Muzeum Narodowego w Warszawie*, Warszawa 1995, s. 323.

[3] A. Treiderowa, *Madżarski (Madziarski) Jan*, Polski Słownik Biograficzny, t. XIX/1, Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk 1974, s. 128.

Украіна), дзе паказвае сябе не толькі высокапрафесійным, але і вельмі таленавітым майстрам. У 1757 г. беларускія ткачы Томаш Хаецкі і Ян Гадоўскі, адасланыя князем Міхаілам Казімірам Радзівілам (1702–1762) у Станіслаў на навучанне, а магчыма, і з патаемнай "дыпламатычнай" місіяй пераманіць да радзівілаўскага двара ў Нясвіжы кваліфікаваных усходніх майстроў[4], здатных узначаліць княжаскую ткацкую майстэрню, знаёмяцца з Маджарскім, і дакладаюць князю пра яго таленты і натуральнае жаданне знайсці ім лепшае прымяненне. Міхаіл Казімір Радзівіл запрашае Маджарскага ў свае ўладанні, на нясвіжскую мануфактуру паясоў.

24 студзеня 1758 г. ў нясвіжскім замку паміж князем Радзівілам і Янам Маджарскім была падпісана дамова, паводле якой Маджарскі – "персідскай, турэцкай, кітайскай, litaznай матэрыі і работы майстр" абавязваўся "ад даты гэтага кантракта" вырабляць "усялякія матэрыі, як напрыклад: макаты, дываны, паясы… з кветкамі, асобамі, цыфрамі золатам, срэбрам і шоўкам паводле паданага эскізу" і навучаць радзівілаўскіх ткачоў ("хлопцаў") "гэтай персідскай рабоце". Князь, у сваю чаргу, пастанаўляў майстру "штотыдневую пенсію па адным залатым дукаце, які своечасова выплочвацца павінен" і даваў дазвол "калі не будзе ставаць казённай працы… для свайго пажытку і выгады са сваіх матэрыялаў ці паясы, ці іншае ягонае мастацтва рабіць і прадаваць"[5].

Дзякуючы намаганням Маджарскага радзівілаўская мануфактура ў Нясвіжы пачала ператварацца ў адно з вядучых прадпрыемстваў Рэчы Паспалітай па вытворчасці кунтушовых паясоў. Ужо за першыя чатыры гады працы майстра, майстэрня была цалкам рэарганізавана, а яе прадукцыя стала заваёўваць усе больш шырокую вядомасць сярод шляхты.

У маі 1761 г. Маджарскі разам з двума працаўнікамі мануфактуры, "вучнем Янам Слівінскім і парабкам Янам Змачынскім"[6], патаемна пакідаюць Нясвіж, прыхапіўшы з сабою два пояса. Князь пасылае за імі ў пагоню. У Бродах уцекачы былі высачаны і злоўлены. Падданых Радзівіла арыштавалі і разам з паясамі вярнулі князю. З Маджарскім аб вяртанні ў Нясвіж паспрабавалі "лагодна дамовіцца", бо ў кантракце 1758 г. не быў абгавораны тэрмін яго дзеяння, а ў такім выпадку дамова звычайна не доўжылася больш чым тры гады. Міхаіл Казімір Радзівіл быў зацікаўлены у майстры, у далейшым супрацоўніцтве з ім. А паколькі свой учынак

4 А.П. Грицкевич, *Op. cit.*, с. 48.

5 *НГАБ*, ф. 694, воп. 2, спр. 7430, л. 1.

6 A. Kasprzak, *O persjarniach radziwiłłowskich w latach 1757–1764*, Ars Armeniaca. Sztuka ormiańska ze zbiorów polskich i ukraińskich. Katalog wystawy. Muzeum Zamojskie; Zamość 2010, s. 109.

Маджарскі патлумачыў тугой па сям'і, якая засталася ў Стамбуле, то, па загаду князя і пры дапамозе львоўскага купца-армяніна Рыгора Нікаровіча, з Асманскай імперыі на Беларусь была перавезена сям`я Маджарскага – жонка і сын Лявон[7].

У 1760 г. Міхаіл Казімір Радзівіл атрымаў у спадчыну ад свайго заўчасна памерлага малодшага брата – князя Гераніма Фларыяна Радзівіла (1715–1760) – слуцкія землі. Сярод маёмасці, што перайшла да Міхаіла Казіміра была і слуцкая майстэрня паясоў. Князь вырашае аб'яднаць нясвіжскае і слуцкае прадпрыемствы ў адно, змясціўшы іх у Слуцку, што і было зроблена прыкладна ў 1762 г.[8] З гэтага моманту распачалася гісторыя знакамітай слуцкай мануфактуры па вытворчасці кунтушовых паясоў.

У сярэдзіне 1770-х гг. наступны гаспадар фабрыкі князь Караль Станіслаў Радзівіл (1734–1790) перадаў мануфактуру ў арэнду Маджарскаму. 20 мая 1776 г. галоўны камісар радзівілаўскіх уладанняў Міхал Радзішэўскі і Ян Маджарскі падпісалі адпаведны кантракт, які падцвердзіў здачу фабрыкі ў арэнду "з усімі вучнямі і варштатамі, што ў ей знаходзяцца" за "дабрахвотна прапанаваную і ўзгоднёную плату … у суме 10 000 злотых польскіх штогод". Маджарскі меў права "распараджацца фабрыкантамі", абавязваўся "не дапускаць ніякага свавольства, трымаць іх у строгай дысцыпліне, злачынных караць, разбэшчаных і непадатлівых да выпраўлення выдаляць", а таксама самастойна выплочваць працаўнікам "кармавыя грошы… без усялякіх прэтэнзій да княжаскай казны". Пры ўзнікненні неабходнасці ў прыёме на мануфактуру новых работнікаў, Маджарскаму было прадпісана "прымаць ў рамяство… іншых панскіх падданых, абы яны былі цвярозымі і не выклікалі падазрэнняў, а з ліку чужых нікога не прымаць"[9]. Першапачаткова дамова была заключана тэрмінам на адзін год, але штогод прадоўжвалася.

У канцы 1770-х гг. Ян Маджарскі перадаў кіраўніцтва мануфактурай і права яе арэнды свайму сыну Лявону[10], які, як бачна, ужо дасягнуў неабходнай майстэрскай і творчай сталасці, каб паспяхова прадоўжыць сямейную справу, спачатку, верагодна, пад наглядам бацькі, а потым – самастойна. Магчыма, адной з прычын перадачы ўсіх паўнамоцтваў на

[7] T. Mańkowski, *Pasy polskie*, Kraków 1938, s. 33.
[8] И. Скворцова, *К вопросу о датировке слуцких поясов*, Художественная культура армянских общин на землях Речи Посполитой: Материалы Международной научной конференции (Минск, 9–11 октября 2012), сост. И.Н. Скворцова, Минск 2013, с. 192.
[9] *НГАБ*, ф. 694, воп. 2, спр. 7430, л. 15.
[10] И. Скворцова, *Op. cit.*, с. 192.

мануфактуры Лявону была і тая, што Ян Маджарскі збіраўся здзесніць вандроўку ў Стамбул, што ў тыя часы было справай няхуткай і дастаткова небяспечнай. Вандроўка адбылася ў 1780 г., яе галоўнай мэтай быў вышук і збіранне дакументаў (сапраўдных ці фіктыўных), якія маглі б стаць сведчаннем высакароднага паходжання продкаў Маджарскіх[11]. Ян Маджарскі марыў аб узвядзенні сябе і сваіх нашчадкаў у шляхецкае саслоўе, а працэс набілітацыі, акрамя прызнання высокіх заслуг суіскальніка, вымагаў і дакументальнага падцверджання.

Мара майстра здзейснілася. У 1790 г. "за развіцце раместваў у дзяржаве" род Маджарскіх быў набілітаваны – узведзены ў шляхецкае саслоўе, атрымаў герб "Дар", акрамя таго, у 1792 г. Лявон Маджарскі быў адораны пасадай ротмістра Навагрудскага ваяводства і ганаровым тытулам каралеўскага камергера[12].

Апошняя згадка ў дакументах пра Яна Маджарскага датуецца 1796 г.[13] Верагодна, хутка неўзабаве пасля гэтага ён памер, як бачна, у дастакова сталым па тых часах узросце. Калі дапусціць, што на момант прыезду ў Станіслаў майстру было не менш за дваццаць – дваццаць пяць гадоў (нагадаем, што дакладная дата нараджэння Яна Маджарскага не высветлена) і дадаць тыя гады, што ен працаваў у Рэчы Паспалітай (прыкладна з 1750-х гг.), атрымліваецца крыху болей за шэсцьдзесят гадоў.

Месца пахавання Яна Маджарскага невядома, хаця відавочна, гэта мог быць бернардынскі касцел святога Антонія ў Слуцку, у якім у 1811 г. быў пахаваны Лявон Маджарскі. На жаль, храм да нашых дзён не захаваўся.

Лявон Маджарскі падаўжаў арэндаваць слуцкую мануфактуру да 1807 г., арэнда фабрыкі была выгаднай справай, нягледзячы на выплату вялікіх грашовых сум у княжаскую казну. І толькі з канца XVIII ст. даходы Лявона Маджарскага істотна знізіліся, а мануфактура паступова пачала прыходзіць у заняпад. Гэта было абумоўлена агульнадзяржаўным крызісам у галіне вытворчасці кунтушовых паясоў, які быў выкліканы палітычнай гісторыяй Рэчы Паспалітай, а менавіта яе гвалтоўнымі падзеламі ў 1772, 1793 і 1795 гг. паміж суседнімі дзяржавамі – Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй. Беларускія землі былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі – цэнтралізаванай краіны з моцнай вярхоўнай уладай, якая адразу пачала праводзіць палітыку, накіраваную на нівеліроўку мясцовых асаблівасцей, канчатковай мэтай якой было збліжэнне і зліцце новага краю з

[11] J. Chruszczyńska, *Op. cit.*, s. 323.
[12] А.П. Грицкевич, *Op. cit.*, с.. 50; J. Chruszczyńska, *Op. cit.*, s. 324–325.
[13] J. Chruszczyńska, *Op. cit.*, s. 323.

уласна расійскімі рэгіенамі. Адным са шматлікіх мерапрыемстваў гэтай палітыкі стала забарона шляхце насіць нацыянальны кунтушова-жупанны строй, неад’емнай часткай якога быў шаўковы пояс. У такіх умовах попыт на прадукцыю персіярань імкліва падае.

Пра складанае становішча мануфактуры і свае жаданне адмовіцца ад арэнды прадпрыемства Лявон Маджарскі дакладаў радзівілаўскай адміністрацыі ў 1792 г. і ў 1795 г.[14] Майстра ўтрымлівала толькі тое, што княжаская казна мела перад ім доўг на вялікую суму грошай: у 1805 г. ён складаў 234 564 злотых 10 грошай[15]. Для пагашэння доўгу ў лістападзе 1807 г. з уладанняў князя Дамініка Гераніма Радзівіла (1786–1813), спадкаемцы Караля Станіслава Радзівіла, Лявону Маджарскаму ў трохгадовую арэнду быў дадзены маентак Манькаў, пасля чаго Маджарскі адмовіўся ад фінансавых прэтэнзій да князя і завяршыў арэнду фабрыкі[16].

Пасля адмовы Лявона Маджарскага ад кіраўніцтва і арэнды, мануфактура перайшла пад нагляд радзівілаўскай адміністрацыі, якая прадпрымала адчайныя спробы рэаніміраваць вытворчасць, якія, аднак, поспеху не мелі: арэндатары фабрыкі часта мяняліся, падалі аб’емы вытворчасці, пагаршалася якасць вытканых паясоў, фабрыка няўмольна рухалася да заняпаду. У 1846 г. легендарнае слуцкае прадпрыемства знікла[17].

За працяглы час існавання дзейнасць слуцкай фабрыкі не была роўнай – яна ведала перыяды ўздымаў і перажывала крызісы. Але самыя значныя поспехі і дасягненні прадпрыемства прыйшліся на час, калі яго ўзначальвалі Ян і Лявон Маджарскія – на 1762–1807 гг. Менавіта тады намаганнямі Маджарскіх на мануфактуры быў распрацаваны адметны мастацкі стыль слуцкіх паясоў, які арганічна злучыў традыцыі ўсходнега і заходнееўрапейскага мастацтва з элементамі беларускай мастацкай культуры.

З паясоў усходніх была цалкам запазычана агульная кампазіцыйная структура слуцкага пояса, якая заставалася нязменнай на ўсім працягу дзейнасці персіярні. Пояс складаецца з трох выразна абазначаных кампанентаў – двух роўнавялікіх канцоў (іх яшчэ называюць “галовамі”) і выцягнутай цэнтральнай часткі – так званага “сярэдніка”[18]. Палі галоў і сярэдніка па перыметры акантаваны арнаментальнымі бардзюрамі-шлячкамі, прычым шлячкі, што ідуць уздоўж тканіны, заўседы шырэйшыя за папярочныя.

---

[14] J. Chruszczyńska, *Op. cit.*, s. 325.
[15] *НГАБ*, ф. 694, воп. 2, спр. 7430, л. 83–88.
[16] T. Mańkowski, *Op. cit.*, s. 44.
[17] J. Chruszczyńska, *Op. cit.*, s. 302.
[18] T. Mańkowski, *Op. cit.*, s. 2.

Сярэдняя даўжыня слуцкага пояса вагаецца ад трох да чатырох з паловай метраў, шырыня – прыкладна 30–35 сантыметраў. Адносна агульных памераў пояса параўнаўча невялікай з'яўляецца вышыня галоў – у сярэднім каля 20 сантыметраў[19]. Канцы слуцкіх паясоў звычайна аздоблены прышыўнымі махрамі, якія надаюць мастацкаму вобразу выраба завершанасць. Махры маюць выгляд або паасобку звісаючых нітак, або нітак, падзеленых на пасмы і замацаваных папярочнай ніткай, дзякуючы чаму ў верхняй частцы махроў утваралася своеасаблівая плеценая "рашэцістая" кампазіцыя. Даўжыня махроў, як правіла, складае ад паловы да двух трэцяў вышыні галавы пояса разам са шлячкамі.

Паводле тэхнічных асаблівасцей стварэння малюнка слуцкія паясы падзяляюцца на: *аднабаковыя аднавонкавыя*, яны маюць вонкавы і адваротны бакі; *аднабаковыя двухвонкавыя*, яны таксама маюць вонкавы і адваротны бакі, але паловы пояса па шырыні ліцавога боку адметныя па колеры; *двухбаковыя двухвонкавыя* – кожны бок вонкавы; *двухбаковыя трохвонкавыя*, яны таксама не маюць адваротнага боку, але па колеры адрозніваюцца толькі паловы аднаго вонкавага боку; *двухбаковыя чатырохвонкавыя* – кожная з паловаў абодвух бакоў выкарыстоўвалася як вонкавая[20].

Самым распаўсюджаным і дасканалым відам слуцкіх паясоў з'яўляецца двухбаковы чатырохвонкавы пояс. Прыгадаем, што ў Рэчы Паспалітай кунтушовыя паясы насілі склаўшы па даўжыні напалову (радзей – у тры складанні). Такім чынам, двухбаковы чатырохвонкавы слуцкі пояс можна было павязваць у розных жыццевых сітуацыях і з рознымі, адметнымі па колеры касцюмамі. У залежнасці ад выкарыстання таго ці іншага каляровага боку, пояс мог выступаць і як святочны, і як штодзенны, і як "жалобны".

Усходняя традыцыя была захавана і ў асноўных прынцыпах арнаментальнай дэкарацыі слуцкіх паясоў: у галовах пояса размяшчалі некалькі аднолькавых выяў стылізаваных квітнеючых раслін ці кветкавых медальенаў, поле сярэдніка трактавалася як аднастайная прастора: гладкая, неарнаментаваная; затканая суцэльным геаметрычным ці раслінным арнаментам з дробным малюнкам; вырашаная ў выглядзе папярочных палос і інш. Дэкор шлячкоў меў выгляд кветкавай гірлянды або расліннага бегунка. У

[19] Сярэднія памеры вызначаны на падставе вывучэння калекцый слуцкіх паясоў, што зберагаюцца ў музейных зборах Беларусі, Польшы, Украіны, Літвы і Расіі.
[20] Г.В. Казарновская, *Технология слуцких поясов на современном ткацком оборудовании*, Художественная культура армянских общин на землях Речи Посполитой. Материалы Международной научной конференции (Минск, 9–11 октября 2012), сост. И.Н. Скворцова, Минск 2013, с. 218.

першае дзесяцігоддзе дзейнасці мануфактуры колькасць раслінных матываў на канцах пояса магла даходзіць да трох ці чатырох, але ўжо з канца 1760-х гг. іх лічба абмяжоўваецца двума, і застаецца такой да завяршэння працы прадпрыемства.

Выяўленчай мове слуцкіх паясоў перыяду росквіту мануфактуры (1770–1790-я гг.) ўласцівы аднaчасова і пэўная ўстойлівасць дэкаратыўна-арнаментальных матываў на канцах паясоў, у сярэдніку, на шлячках-бардзюрах, і вялікая разнастайнасць іх спалучэнняў у вырабах. Тлумачучы гэта, польская даследчыца Ядзвіга Хрушчыньска ў 1992 г. выказала гіпотэзу, што на мануфактуры, хутчэй за ўсе, былі распаўсюджаны падрыхтоўчыя эскізы, зробленыя не для цэлага пояса адразу, а толькі для яго пэўных частак – галоў, рапортаў сярэдніка, шлячкоў, якія ў залежнасці ад неабходнасці маглі кампанавацца разам, у адзін выраб, у шматлікіх і разнастайных варыянтах[21]. Гэта версія падаецца праўдзівай, хаця дакументальных доказаў ёй няма, – у лістападзе 1812 г. слуцкая фабрыка была практычна цалкам зруйнавана і спустошана рускімі войскамі з арміі адмірала Чычагава[22], як бачна, тады загінулі і альбомы ўзораў, якія абавязкова павінны былі быць на прадпрыемстве.

Шматварыянтнасць злучэнняў у вырабах слуцкай мануфактуры пазнавальных, устойлівых тыпаў арнаментацыі галоў, сярэдніка і шлячкоў стала прычынай, што пры стварэнні тыпалогіі арнаментальных матываў слуцкіх паясоў падаецца мэтазгодным разглядаць дэкаратыўна-арнаментальныя матывы вышэйпералічаных частак слуцкіх паясоў паасобна.

Найбольшае распаўсюджанне ў навуцы атрымаў прыем тыпалогіі слуцкіх паясоў паводле кампазіцый і дэкаратыўных раслінна-кветкавых матываў, змешчаных у полі галоў[23]. Прычым, важна адзначыць, што адзінай, агульнапрынятай тыпалогіі не існуе. Кожны з даследчыкаў, хто займаўся гэтай праблемай, выпрацоўваў і прапаноўваў уласную класіфікацыю-тыпалогію.

---

[21] Цыт. па: Э. Арліньска-Мяноўска, *Калекцыя тэкстыльных паясоў у зборах Нацыянальнага музея ў Варшаве*, Слуцкія паясы і літургічнае адзенне са збораў Нацыянальнага музея ў Варшаве і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Каталог выстаўкі 5 лістапада 2014 – 6 красавіка 2015 г. Мінск, аўт. тэкстаў, складальнікі Э. Арліньска-Мяноўска [і інш.], Мінск 2014, с. 16–17.

[22] J. Chruszczyńska, *Op. cit.*, s. 301.

[23] Напрыклад: T. Mańkowski, *Op. cit.*, s. 38, 43; Л.І. Якуніна, *Слуцкія паясы*, Мінск 1960, с. 29, 31; M. Taszycka, *Polskie pasy kontuszowe*, Kraków; Wrocław 1985, s. 61; M. Kalamajska-Saeed, *Polskie pasy kontuszowe*, Warszawa 1987, s. 14–24; J. Chruszczyńska, *Op. cit.*, s. 303–304; І.М. Скварцова, *Да пытання аб несігнатурнай атрыбуцыі слуцкіх паясоў*, Паведамленні Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, вып. 3, Мінск 2001, с. 24–35.

У залежнасці ад канкрэтных навуковых задач, якія стаялі перад даследчыкам, колькасць арнаментальных тыпаў, вызначаных у прадукцыі слуцкай мануфактуры, можа дастаткова істотна адрозніваацца. Пры мэце стварэння абагуленай сістэматызацыі кампазіцый, узораў і арнаментаў слуцкіх паясоў, колькасць вылучаных тыпаў абмяжоўваецца двума-трыма, калі вызначаюцца толькі галоўныя, прынцыповыя кампазіцыйныя і выяўленчыя адрознасці, а астатнія не прымаюцца да ўвагі.

Калі ж даследчык мае мэту вырашэння канкрэтных навукова-практычных праблем, звязаных з вывучэннем, атрыбуцыяй і экспертызай, каталагізацыяй слуцкіх паясоў, то папярэдняе ўважлівае вызначэнне адрозных тыпаў дэкору становіцца галоўным навуковым інструментам для далейшых даследаванняў, і ў гэтым выпадку кожная адрознасць з'яўляецца істотнай, што, адпаведна, спрыяе вылучэнню большай колькасці дэкаратыўна-арнаментальных тыпаў, прычым у кожным з адасобленых тыпаў звычайна таксама адрозніваюць шэраг дастаткова ярка выяўленых варыянтаў – своеасаблівых "падтыпаў".

Мы прапаноўваем наступную аўтарскую тыпалогію дэкаратыўна-арнаментальных матываў слуцкіх паясоў, якая была неаднойчы апрабіравана ў час навуковых атрыбуцый і экспертыз кунтушовых паясоў і іх фрагментаў з музейных збораў і прыватных калекцый Беларусі, а таксама з фондаў Музея ўкраінскага народнага дэкаратыўнага мастацтва ў Кіеве і Львоўскага гістарычнага музея.

*Арнаментальныя матывы галоў* слуцкіх паясоў выразна падзяляюцца на шэсць асноўных дэкаратыўных тыпаў: *"карумфіль", "сухарык", "кітайскае воблачка", "уквечаны пень", "букет"* і *"вянкова-медальенны"*. Назвы трох першых тыпаў гістарычныя, вядомыя з дакументальных крыніц, тры апошнія найменні – сучасныя, асацыятыўныя з выявамі.

Кожны з гэтых тыпаў, у сваю чаргу, мае шэраг дастаткова ярка адрозных варыянтаў, асобныя з якіх могуць прэтэндаваць нават на вылучэнне ў самастойны тып.

Адным з першых дэкаратыўна-арнаментальных матываў, распрацаваных на мануфактуры пад уплывам узораў персідскіх паясоў, быў *"карумфіль"*[24]. Яго назва ўтварылася ад скажонага турэцкага слова "гваздзік", – двукхратны паўтор стылізаванага, але пазнавальнага адлюстравання гэтай кветкі, якая "вырастае" з невялікага пагорачка, складае асноўны матыў кампазіцыі. Выява гваздзіка строга сіметрычная, вось сіметрыі праходзіць праз сцябло кветкі (мал. 1).

[24] T. Mańkowski, *Op. cit.*, s. 38.




Мал. 1. Слуцкі пояс тыпу “карумфіль”. Фрагмент. 1780-я – 1807 гг. Музей старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі, Мінск

Пад натхненнем ад арнаментацыі персідскіх і кітайскіх паясоў быў створаны дэкаратыўны тып *“сухарык”*[25]. Яго найменне таксама ўзнікла ад скажонага турэцкага слова, што перакладаецца як “расада”. Кампазіцыя матыва ўтвараецца двукратным адлюстраваннем строга сіметрычнай вытанчанай раслінкі з дастаткова дробнымі кветкамі і вузкімі зубчастымі лісцікамі (мал. 2).

Творчыя эксперыменты з матывамі “карумфіль” і “сухарык” спрыялі стварэнню некалькіх дастаткова адметных варыянтаў арнаментацыі, якія, захоўваючы тыпалагічную блізкасць з першаўзорамі, характарызуюцца шэрагам адрозных рыс, найперш, своеасаблівай трактоўкай кветак на раслінах, у выніку чаго традыцыйны ўсходні гваздзік трансфармуецца ў мясцовы васілек – валошку (мал. 3), якая можа выяўляцца ў фас і профіль, і ў пышнай квецені, і як сціплы бутон; або з’яўленнем у расліны далікатных карэньчыкаў.

---

[25] M. Kalamajska-Saeed, *Op. cit.*, s. 21.



Мал. 2. Слуцкі пояс тыпу “сухарык”. 1770-я – 1790-я гг.
Мінскі абласны краязнаўчы музей ў г. Маладзечна



Мал. 3. Слуцкі пояс тыпу “карумфіль” з выявай валошкі. Фрагмент. Слуцк. 1780-я – 1807 гг. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Мінск

На прыканцы XVIII – у першыя дзесяцігоддзі XIX ст. на слуцкай мануфактуры шырока выкарыстоўваўся яшчэ адзін дастаткова самастойны арнаментальны матыў аздобы канцоў паясоў, які вытанчанасцю свайго малюнка аддалена нагадвае дэкаратыўны тып “сухарык” пры візуальным падабенстве адлюстраванай расліны да квітнеючага лену (мал. 4).




Мал. 4. Слуцкі пояс тыпу "сухарык" з выявай лёну. Фрагмент.
1780-я – 1807 гг. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Мінск

Персідскія паясы з выявамі арнаментальна-кветкавых медальенаў на канцах паслужылі прыкладам для стварэння на слуцкай фабрыцы дэкаратыўнай кампазіцыі "*вянкова-медальённага*" тыпу. Яна ўтворана двухразовым паўтарэннем сіметрычнага адлюстравання выцягнутага па вертыкалі вянка, сплеценага з дробных, на доўгіх ножках, кветак кшталту гваздзічкоў, валошак ці рамонкаў. Злева і справа ад вянкоў адлюстраваны



Мал. 5. Слуцкі пояс “вянкова-медальённага” тыпу. Фрагмент.
1780-я – 1807 гг. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Мінск

траўныя сцяблінкі, якія плаўна загінаюцца па сілуэту бліжэйшага вянка. Прамежак між сцяблінкамі запоўнены драбнюткімі выявамі кветак і лісця, скампанаванымі па прынцыпу крыжова-рамбічнага арнамента. Сцяблінка з мяцёлачкамі на канцах, звернутымі ў адваротны бок адносна бліжэйшай цэнтральнай, і палова геаметрызаванага расліннага арнаменту адлюстроўваюцца і з другога боку вянкоў. Разам з цэнтральнай сцяблінкай і арнаментам яны ўтвараюць своеасаблівае атачэнне – акантоўку вянка (мал. 5). Выявы сіметрычныя адносна і вертыкальнай, і гарызантальнай восі сіметрыі.

Гэты матыў быў адным з улюбеных на слуцкай мануфактуры. На працягу дзейнасці прадпрыемства ён атрымаў развіцце ад форм адносна простых, маючых відавочныя паралелі з дэкорам арыентальнага тэкстылю, да арнаментацыі складанай, шматкампанентнай, толькі вельмі аддалена суадноснай з усходнімі прататыпамі.

Усходняе паходжанне вызначае і наступны дэкаратыўны тып слуцкіх паясоў – "*кітайскае воблачка*". Яго назва ўтварылася дзякуючы хвалістай стужцы, што акаляе адлюстраванне ўквечанай расліны. Стужка падобная да выцягнутага ланцужка воблачкаў[26] – аднаго з частых упрыгажэнняў кітайскага мастацкага тэкстылю і парцаляны.

У гэтым тыпе дэкору яскрава вылучаюцца тры розныя варыянты, утвораныя двухразовым паўторам:
- арнаментальнай кампазіцыі ў выглядзе сіметрычнай расліны з чатырма пышнымі кветкамі на бакавых сцяблінах і двума меншымі на цэнтральнай, заключанай у суцэльны медальен хвалістай стужкі;
- сіметрычнай кветкавай гронкі з пяццю дамінуючымі кветкамі – большай цэнтральнай і крыху меншымі за яе бакавымі, якія кампануюцца на вяршынях ілюзорнага ромба. Зверху і знізу расліна ахінаецца "воблачкавымі" стужкамі-рукавамі;
- асіметрычнай ўквечанай расліны з гнуткімі сцяблінкамі і трыма дамінуючымі кветкамі, вакол якой адлюстраваны тры "разарваных" ланцужкі хвалістай стужкі, таксама асіметрычныя (мал. 6).

Паясы тыпу "кітайскае воблачка" выраблялiся на слуцкай мануфактуры толькі ў час кіраўніцтва Яна Маджарскага – не пазней 1770-х гг.[27] Цікава, што на некаторых паясах з такім дэкорам побач з дамінуючымі кветкава-стужкавымі матывамі адлюстроўваюцца невялічкія, амаль схематычныя выявы людзей, жывел і птушак.

[26] T. Mańkowski, *Op. cit.*, s. 21, 38.
[27] И. Скворцова, *К вопросу о датировке слуцких поясов..*, с. 195.



Мал. 6. Слуцкі пояс тыпу “кітайскае воблачка”, трэці варыянт дэкору. 1760-я гг. Музей ўкраінскага народнага дэкаратыўнага мастацтва, Кіеў

У адрозненне ад папярэдне пералічаных тыпаў, якія ў той ці іншай ступені арыентаваліся на ўсходні мастацкі тэкстыль, пры распрацоўцы кампазіцый дэкаратыўнага тыпу “*букет*” у сіметрычны выяўленчы матыў з адлюстраваннем некалькіх, сабраных у пучок, уквечаных раслін, уводзіліся элементы, запазычаныя з еўрапейскіх мастацкіх стыляў, найперш – моцна стылізаваныя выявы кветак кшталту півоняў, лотацяў, лілей, і дэкаратыўных падставакі-ваз, у якіх расліны змяшчаюцца (мал. 7).

Адметнае месца сярод іншых матываў галоў займаюць кампазіцыі тыпу “*уквечаны пень*”. Гэты тып дэкору не мае прамых аналогій ні ва



Мал. 7 Слуцкі пояс “букетавага” тыпу. 1780-я – 1807 гг.
Музей ўкраінскага народнага дэкаратыўнага мастацтва, Кіеў




Мал. 8. Слуцкі пояс тыпу “уквечаны пень”, першы варыянт дэкору. 1780-я – 1807 гг. Львоўскі істарычны музей

ўсходнім, ні ў заходнееўрапейскім тэкстылі. Адно з дамінуючых месцаў у ім належыць выявам сухіх, “выкарчаваных” пнёў, з якіх выбіўся малады парастак, што расквітнеў дзвюма вялікімі пышнымі кветкамі. У гэтым тыпе вылучаюцца два адрозныя варыянты:

- матыў будуецца з двухразовага паўтору пня, парастка і кветак, якія кампануюцца “ланцужком” па вертыкальнай восі: пень – парастак – кветкі (мал. 8);

- двойчы паўтараецца наступнае адлюстраванне: два гнуткія парасткі, укевечаныя буйнымі моцна стылізаванымі кветкамі, прарастаюць з засохлых пнеў, тонкія сцябліны парасткаў пераплятаюцца між сабой, праз кропкі іх перасячэнняў праходзіць вертыкальная вось сіметрыі (мал. 9).

*Арнаментальна-пластычныя рашэнні дэкору сярэдніка і бардзюраў* слуцкіх паясоў, у параўнанні з кампазіцыямі канцоў, адрозніваюцца значна большай кансерватыўнасцю, амаль цалкам паўтараючы ўсходнія першаўзоры. Арнаментацыя поля сярэдніка зводзіцца да трох асноўных варыянтаў, кожны з якіх меў некалькі асобных мадыфікацый.

*Першы* запазычаны з персідскага тэкстылю, ён мае назву “карпавай лускі”, якую візуальна нагадвае сваім малюнкам. На слуцкай мануфактуры выкарыстоўвалі і класічны арнамент гэтага віду, і ўскладнены – з павялічаным памерам “лускавінак” і кампаноўкай унутр кожнай з іх выявы маленькай стылізаванай кветкі або трохлісніка.

*Другі* варыянт дэкаратыўнага вырашэння сярэдніка ў выглядзе папярочных палос роўнай або прыкладна роўнай шырыні таксама мае ўсходняе паходжанне. Ен актыўна выкарыстоўваўся на прадпрыемстве Слуцка. У першыя два дзесяцігоддзі дзейнасці мануфактуры перавага аддавалася або гладкім, папярочным палосам, акаймленым па даўжыні беражкамі ў выглядзе ланцужка маленькіх ромбаў, прастакутнікаў, ці тонкай хвалістай стужкі; палосы маглі быць і манахромнымі, і двух адметных колераў. Або чаргаванню двух папярочных палос – адной гладкай з вузкімі арнаментаванымі беражкамі і другой запоўненай раслінна-кветкавым бегунком розных кшталтаў.

Паступова разнастайных мадыфікацый дэкору сярэдніка папярочна-паласатага варыянту становіцца значна больш, асабліва пасля пераходу слуцкай мануфактуры пад кіраўніцтва Лявона Маджарскага. Гэта арнаментацыя ў выглядзе манахромных палос, канцы якіх акцэнтаваны папераменнымі адлюстраваннямі рамбічных і абстрактна-геаметрычных форм. Гэта дэкор, пабудаваны на рытмічным паўторы двух арнаментаваных палос, адна з якіх заткана раслінным бегунком, а другая – геаметрычным ці абстрактна-геаметрычным арнаментам. Гэта таксама шырокі спектр ускладненых арнаментальных сістэм, пабудаваных на паўтарэнні рапортаў з трох ці чатырох папрочных палос рознай шырыні, затканых расліннымі, геаметрычнымі ці абстрактна-выяўленчымі адлюстраваннямі разнастайных кшталтаў.

*Трэці* варыянт дэкору сярэдніка сустракаецца ў вырабах слуцкай персіярні дастаткова рэдка. Ен мае выгляд манахромнага поля, праз роў-



Мал. 9. Слуцкі пояс тыпу “уквечаны пень”, другі варыянт дэкору.
1770-я – 1790-я гг. Слуцкі краязнаўчы музей

ныя прамежкі ўпрыгожанага радамі вялікіх кружкоў. Кружкі кожнага наступнага раду размяшчаюцца адносна кружкоў папярэднега ў шахматным парадку.

*Дэкаратыўнае аздабленне шлячкоў-бардзюраў* слуцкіх паясоў звычайна вырашаецца наступным чынам. *Папярочныя шлячкі*, якія абмяжоўваюць вышыню кампазіцыі галавы пояса, затканыя раслінным бегунком. У выпадках, калі поле сярэдніка таксама мае палосы з раслінным бегунком, то выгляд такой паласы і шлячка будзе цалкам супадаць. *Прадольныя шлячкі* пояса, шырэйшыя за папярочныя, аздабляюцца або суцэльнымі хвалістападобнымі кветкава-расліннымі гірляндамі або перарывістымі адлюстраваннямі раслінных атожылкаў з дробнымі кветкамі, якія на пэўнай адлегласці таксама ўспрымаюцца як часткі рытмічнай гірлянды. Папярочныя і прадольныя шлячкі-бардзюры заўсёды акантаваны беражкамі з геаметрычным арнаментам, як правіла, у выглядзе адзінарных ці двайных ланцужкоў чатырохкутнікаў.

Слуцкія паясы і іх фрагменты, створаныя ў розныя перыяды дзейнасці мануфактуры, захаваліся ў музейных фондах і прыватных калекцыях многіх краін. Надзвычай цікавымі зборамі паясоў валодаюць Музей ўкраінскага народнага дэкаратыўнага мастацтва ў Кіеве і Львоўскі гістарычны музей, за прадастаўленую магчымасць працы з калекцыямі якіх хацелася б выказаць шчырую ўдзячнасць супрацоўнікам гэтых музеяў.